4. М. Л. Князева. СМИ в контексте культуры: некоторые опасные тенденции // Журналистика – 2005: Материалы научно-практической конференции. – М., 2005.

**Наталля Кузьміч**
**Беларускі дзяржаўны універсітэт**

## ЛІТАРАТУРНАЯ КРЫТЫКА: РЭТРАСПЕКТЫЎНЫ АГЛЯД

Неабходнасць у крытычным асэнсаванні літаратуры існавала заўсёды. Гэта можна заўважыць яшчэ ў прадмовах і пасляслоўях Ф. Скарыны, творах С. Полацкага, рукапісных рыторыках XVIII стагоддзя і інш. Больш змястоўныя ацэнкі твораў даследчыкі адносяць да XIX ст.

На пачатку XX ст. з’яўляецца шэраг беларускамоўных часопісаў і газет, на старонках якіх пераважалі публікацыі, якія можна аднесці да літаратурнай крытыкі. Гэта матэрыялы да дня нараджэння пэўнага пісьменніка, гадавіны смерці з элементамі крытычный ацэнкі творчасці. Пазней з’яўляюцца і водгукі на новыя кнігі. Асноўныя жанры крытыкі ў гэты час: бібліяграфічныя нататкі, водгукі на новыя творы, палемічныя выступленні.

Сярод крытычных матэрыялаў 20-х гг. дамінуе водгук на новы твор, у якім нярэдка вылучаўся асабісты пункт гледжання аўтара. Пасля грамадзянскай вайны з’яўляюцца літаратурна-мастацкія часопісы, фарміруюцца розныя творчыя згуртаванні, але ж дамінуючымі былі пралеткультаўскія ўстаноўкі, у крытыцы за аснову бралася ідэя класавасці, а мастацкасць твора ігнаравалася. На пачатку 40-х гадоў з’яўляецца цікавасць да праблемы народнасці мастацтва. У друку змяшчаюцца ў пераважнай большасці публікацыі асветніцкага характару, прымеркаваныя да юбілеяў; з’яўляюцца водгукі на творы пачаткоўцаў.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны аднаўляюцца літаратурна-мастацкія выданні, дзе друкуюцца артыкулы як дастаткова агульнага плану (пра багатую гісторыю, культуру беларускага народа), так і звязаныя з творчасцю канкрэтных пісьменнікаў. Прычым, у некаторых артыкулах і рэцэнзіях рабіліся спробы вызначыць недахопы ў творах і выявіць іх прычыны. Але ж вартасць твора вызначалася адным – актуальнасцю тэматыкі. Больш пашыраным стаў водгук на канкрэтны твор. У сярэдзіне 50-х крытыка звяртаецца да даследавання прыроды мастацкай творчасці, індывідуальнасці мастака слова: увага ўдзяляецца мастацкасці твора, праблеме стылю, эстэтыцы, глыбіні асэнсавання жыцця пісьменнікам. Аналіз твора стаў не тэматычным, а праблемным. Адбылося і вяртанне да палемічнага жан-

ру: на старонках літаратурна-мастацкіх выданняў разгортваецца дыскусія (уздымаюцца праблемы сучаснага беларускага рамана, пісьменніцкага майстэрства, маладой паэзіі і інш.). Паступова ўвага скіроўваецца на даследаванне спецыфічных асаблівасцей літаратурных жанраў, адметнасцей пісьменніцкай манеры, на даследаванне класічнай спадчыны, літаратурных узаемасувязей. Перад крытыкай стаяла задача асэнсавання найбольш плённых здабыткаў і пошукаў пісьменнікаў, вызначэння прычын іх няўдач; акцэнт ставіўся на новым прачытанні літаратурнай спадчыны.

Напрыканцы XX ст. асноўная ўвага беларускай літаратурнай крытыкі на старонках спецыялізаванага друку надавалася даследаванню творчай індывідуальнасці пісьменніка, вызначэнню месца яго творчасці ў літаратурным працэсе. Крытыкі працягваюць звяртацца да новага прачытання літаратурнай класікі, вяртання да чытача творчасці пісьменнікаў-эмігрантаў, канкрэтны твор разглядаецца ў кантэксце творчасці аўтара, а творчасць асобнага аўтара – у кантэксце літаратурнага працэсу. У крытыцы закладваюцца асновы метаду сістэмна-цэласнага аналізу літаратурнага твора. Заўважныя пошукі формы і зместу (напрыклад, матэрыялы пад рубрыкамі «Ураджанне», «Прачытанне» ў штотыднёвіку «ЛіМ»; у часопісе «Крыніца» змяшчаюцца меркаванні розных аўтараў пра творчасць пэўнага пісьменніка; спрабуюць выказаць свае думкі маладыя крытыкі на старонках часопіса «Першацвет» і г. д.), ёсць і цікавыя знаходкі (напрыклад, публікацыі пад рубрыкамі «Бліц-крытыка», «Гарбата ў Шніпоў» у «ЛіМе» і інш.).

На жаль, крытыка паступова страчвае сваю актыўнасць (а літаратуразнаўства, наадварот, набірае моц) – бягучая крытыка ўсё часцей саступае месца літаратуразнаўчым артыкулам, нататкам да пэўных юбілейных мерапрыемстваў, артыкулам асветніцкага характару. Дастаткова рэдка на старонках літаратурна-мастацкіх выданняў з'яўляюцца імёны маладых творцаў, якія пачынаюць працаваць у галіне крытычнай дзейнасці. Змяшчаюцца матэрыялы досыць вядомых крытыкаў і літаратуразнаўцаў або саміх пісьменнікаў. Літаратурная крытыка існуе ў асноўным у такіх жанравых формах, як аглядны артыкул, рэцэнзія, агляд кніжных навінак, анкетаванне пісьменнікаў.

Апошнім часам на старонках спецыялізаванага друку відавочная больш пільная ўвага да матэрыялаў крытыкі, імкненне разнастаіць жанравую палітру матэрыялаў. Напрыклад, калі гэта палемічная нататка, то, у першую чаргу, тут, прысутнічае суб'ектыўнасць і пэўная «аднабаковасць» успрымання (але на тое гэта і палемічная нататка). Варта зазначыць, што ўсё ж такі ў публікацыях часта аналіз твора падмяняецца пералічэннем

яго станоўчых/адмоўных момантаў, канстатацыяй асаблівасцей творчай манеры таго ці іншага аўтара (кшталту, «мае сказаць што адметнае», «даволі арыгінальная», «грунтоўная падборка», «свежа выглядае», «цікавы аўтар» і г. д.). Але, думаецца, усё ж такі бягучай крытыцы не стае дынамікі, дасціпнасці, стылявой лёгкасці, нязмушанасці ў разглядзе твора, аўтарскага бачання, вытлумачэння сэнсу твора, закладзенага пісьменнікам і ўбачанага крытыкам. А аднатыпнасць, насычанасць штампамі, імкненне абмінуць вострыя вуглы толькі выклікае нецікавасць у чытача. Да таго ж крытык павінен не толькі вылучыць станоўчыя моманты таго або іншага твора, але і ўбачыць перспектыву развіцця творчасці яго аўтара.

**Ольга Медведева**
**Белорусский государственный университет**

## ЭКРАННАЯ КУЛЬТУРА: ТЕРРИТОРИЯ НЕИНТЕЛЛЕКТУАЛЬНОЙ ПОШЛОСТИ

Кино и телевидение сегодня, за редким исключением, – территория торжества тирании неинтеллектуальной пошлости (о «тирании интеллектуальной пошлости» в первой половине прошлого столетия рассуждал Ортега-и-Гассет). Вместо художественных образов – массовый экранный продукт. Эксклюзив – то, что имеет отношение к искусству, уже почти неразличим в море валового культурного ширпотреба.

Феномен product placement, соединяющий в себе гипноз экрана и рекламный транс, неуклонно и последовательно «руинизирует» психику зрителей. Известно, что за три часа просмотра телепередач, включая рекламу, замедляется скорость мышления человека. Пиар, промоушен, рейтинг – главные понятия современной художественной жизни и ее регулирующие механизмы. Подлинное ищется в зоне имитации. Особенно это ощутимо в документальном кино. Поэтому появляется, как противовес, манифест «Реальное кино» В. Манского, вызвавший бурную дискуссию («Искусство кино», № 6, 2006).

В манифесте Виталия Манского речь идет о целях и средствах кинодокументалистики, степени ее документальности, мере допустимого авторства и ее взаимоотношениях с жизнью. Есть документальное кино и реальное кино, как утверждает автор манифеста. Документальное кино превратилось в продукт массового потребления. Зрелище отдаляет зрителя от реальности. И если классическое документальное кино снимается, то